Ситуация с трудоустройством музыкантов осложняется тем, что, при несовершенстве современных методов диагностики музыкальных способностей, в некоторых учебных заведениях основной контингент составляют хорошо обученные музыканты-ремесленники; истинные же художники встречаются крайне редко. В результате появляются разочарованные музыканты, которые не смогли стать солистами, а потому вынуждены заниматься педагогической деятельностью, к чему у них, возможно, нет ни способностей, ни призвания.

Функция вуза в профессиональной ориентации студентов непосредственно связана с их психологической адаптацией к будущей деятельности, с необходимостью расширения границ музыкальной жизни, подготовкой музыкантов широкого профиля, владеющих не только специальными, но и общемузыкальными, общекультурными знаниями. Все это и определяет направление музыкального образования в современной культуре.


1. *Асафьев, Б.* Избранные статьи о музыкальном просвещении и образовании / Б. Асафьев. – М. ; Л. : «Музыка», 1965. – 223 с.

2. *Кабалевский, Д.* Воспитание ума и сердца / Д. Кабалевский. – М. : Просвещение, 1981. – 192 с.

3. Проблемы профессионального обучения музыканта: сб. статей. – Ташкент : «Педагогика», 1988. – 217 с.

4. *Самарина, Г. П.* Проблемы эффективности заочного образования / Г. П. Самарина. – М. : «Классика», 2003. – 150 с.

5. *Цыпин, Г. М.* Музыкально-исполнительское искусство: теория и практика / Г. М. Цыпин. – СПб. : Алетейя, 2001. – 318 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


***А. Д. Вавілаў,***
*дацэнт кафедры рэжысуры абрадаў і свят*


# МІЖНАРОДНЫ ФЕСТЫВАЛЬ МАСТАЦТВАЎ «СЛАВЯНСКІ БАЗАР У ВІЦЕБСКУ» ЯК АДЛЮСТРАВАННЕ РЭАЛІЙ РАЗВІЦЦЯ СУЧАСНАГА БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА

«Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» ўяўляе сабою буйнамаштабную дзяржаўную культурную акцыю», – такім вызначэннем, занатаваным у Пастано-

ве Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, за фестывалем праз 18 гадоў з дня яго заснавання замацаваны дзяржаўны статус [1, ст. 1].

18 ліпеня 1992 года ў Віцебску, абласным цэнтры Беларусі, адбыўся першы міжнародны музычны фестываль дзеячаў культуры і мастацтваў Расіі, Беларусі і Украіны. Чаму – Віцебск? Тут, як ні дзіўна, адыграў сваю ролю такі фактар, як амбіцыёзнасць горада і персаналій, якія стаялі ля вытокаў фестывалю. Вядома ж, амбіцыёзнасць – несумненная дабрадзейнасць толькі тады, калі яна чымсьці пацверджана, калі для яе ёсць падстава. Калі ж за ёй нічога няма і амбіцыі ўзнікаюць на пустым месцы, гэта выглядае, сама меней, смешна. Развіваючы ў сабе выключна здаровыя амбіцыі, мы набліжаемся да сваёй мэты: быць лепшымі, быць паспяховымі, весці за сабой іншых.

Віцебск – адзін з найстаражытнейшых гарадоў Беларусі. Ён увайшоў у гісторыю як адзін з цэнтраў мастацкага авангарда. З Віцебскам цесна звязана творчасць мастакоў: Івана Трутнева, Мсціслава Дабужынскага, Іллі Рэпіна, Юдэля Пэна, Казіміра Малевіча, Роберта Фалька, Марка Шагала; жыццё і творчасць асветнікаў мінулага: Францыска Скарыны, Сімяона Полацкага; дзеячаў літаратуры: Гаўрыіла Дзяржавіна, Тараса Шаўчэнкі, Івана Лажэчнікава, Івана Буніна, Міхаіла Бахціна, Еўдакіі Лось, Віталя Вольскага, Уладзіміра Караткевіча і інш. У Віцебску сёння налічваецца каля 228 помнікаў архітэктуры, 136 помнікаў гісторыі і культуры, 4 помніка археалогіі. У горадзе адрэстаўраваны будынкі былой Ратушы[1], касцёл Святой Варвары[2], Пакроўская царква[3], Дабравешчанская царква[4].

Віцебск пачатку і канца ХХ стагоддзя – бясспрэчны культурны цэнтр рэспублікі. Сучасныя тэндэнцыі ў мастацкім, літаратурным і тэатральным жыцці – годны працяг яго мінулага.

З'яўленне на зыходзе ХХ стагоддзя фестывалю «Славянскі базар» уяўляецца абсалютна лагічнай падзеяй. 1990-я гады з'явіліся для ўсяго постсавецкага грамадства надзвычай насычанымі не толькі рознымі палітычнымі і эканамічнымі зрухамі,

[1] Ратуша ў Віцебску – адна з некалькіх гарадскіх ратуш, што захаваліся ў Беларусі. Першы яе будынак узведзены ў 1597 годзе, калі гораду было падорана Магдэбургскае права.

[2] Сабор Святой Варвары (сабор Святой Барбары) – помнік архітэктуры, пабудаваны ў 1783–1785 гг.

[3] Кафедральны Свята-Пакроўскі сабор – помнік архітэктуры XIX стагоддзя.

[4] Помнік старажытнаполацкай архітэктуры XII стагоддзя.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

але і складанымі працэсамі ў духоўным жыцці. У гэтыя гады грамадству ў цэлым быў уласцівы аптымізм, нягледзячы на складаную палітычную і сацыяльна-эканамічную сітуацыю. Працэсы галоснасці і дэмакратызацыі палітычнай сістэмы, здавалася б, сведчылі на карысць таго, што грамадства ў кароткі час ажыццявіць прарыў да якасна новага стану. Менавіта ў гэты час і быў заснаваны Міжнародны музычны фестываль «Славянскі базар».

Такім чынам, гісторыя «Славянскага базару» пачалася 18 ліпеня 1992 года. Заснавальнікамі ў перыяд распаду Савецкага Саюза і ініцыятарамі правядзення фестывалю сталі прыватныя і некамерцыйныя арганізацыі трох дзяржаў: Саюз «Зніч» (старшыня Наталля Машэрава[5]) і Віцебскі гарадскі цэнтр культуры (дырэктар Радзівон Бас[6]), Беларусь, ІПП[7] «Ірыда» (дырэктар Сяргей Віннікаў[8]), Расія, а таксама ІПП «Рок-Акадэмія» (дырэктар Мікалай Красніцкі[9]), Украіна.

Прыватныя прадпрыемствы ў сімбіёзе з дзяржаўнай структурай (Віцебскі гарадскі цэнтр культуры з'яўляўся адным з нізавых звён Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь) уяўлялі сабою вопытны ўзор дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў галіне культуры.

Тры першыя фестывалі (у 1992-м, 1993-м, 1994 гадах) прайшлі з мінімальнай дзяржаўнай падтрымкай, а то і з поўнай яе адсутнасцю як з боку Беларусі, так і з боку Расіі ды Украіны. Касавыя зборы, грошы фундатараў і рэкламадаўцаў з'явіліся асноўнымі крыніцамі сродкаў, на якія «Славянскі базар» існаваў і ўвасабляў у жыццё свае культуралагічныя ідэі. Але ўжо з 1995-га фестываль праходзіць пад асабістым патранатам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі. Міжнародны фестываль мастацтваў, як ён стаў называцца з гэтага года, стаў справай дзяржаўнай важнасці і атрымаў дзейсную падтрымку з боку Прэзідэнта і Урада краіны. З гэтага часу

---

[5] Наталля Пятроўна Машэрава (нар. 1945) – беларускі палітык, доктар філасофскіх навук. Дачка П. М. Машэрава.

[6] Радзівон Міхайлавіч Бас (нар. 1952) – заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, першы генеральны дырэктар Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

[7] ІПП – індывідуальнае прыватнае прадпрыемства.

[8] Сяргей Уладзіміравіч Віннікаў (1959) – адзін са стваральнікаў Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар», галоўны рэжысёр і генеральны прадзюсар фестывалю (1992−1998).

[9] Мікалай Іванавіч Красніцкі, украінскі прадзюсар.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прэзідэнт Беларусі штогод асабіста аб'яўляе ўрачыстае адкрыццё фестывалю.

Аднак рэчаіснасць уносіць свае карэктывы ў далёка ідучыя планы фестывалю. Так, нечакана для партнёраў, але цалкам натуральна для дзеянняў бізнесу таго часу, гандлёвая марка фестывалю «Міжнародная карпарацыя “Славянскі базар”» юрыдычна рэгіструецца ў Расійскай Федэрацыі, а яе фактычным уладальнікам у выніку гэтага кроку робіцца Сяргей Віннікаў, прэзідэнт фестывалю.

Украінскі бок на той час адмаўляецца ад актыўнага ўплыву на фестываль на карысць Сяргея Віннікава і пераводзіць сваю нацыянальную дэлегацыю ў «аўтаномнае плаванне», увогуле не ўдзельнічаючы надалей у фінансаванні фестывалю як заснавальнік. Саюз «Зніч» таксама спыняе свой удзел у жыцці «Славянскага базару».

Беларускі дырэктарат фестывалю, абапіраючыся на падтрымку Прэзідэнта краіны, прымае рашэнне аб *нацыяналізацыі* музычнага форуму. Рэгіструецца новая гандлёвая марка – *«Міжнародны фестываль мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”».* Фестываль становіцца сумесным культурным праектам *Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі* і фінансуецца адпаведна.

«Праз мастацтва – да міру і паразумення» – абвяшчае дэвіз фестывалю, а на працягу апошніх гадоў так завецца Спецыяльная ўзнагарода Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якая прысуджаецца дзеячам мастацтва і культуры за асаблівыя заслугі ў справе захавання і прымнажэння культурнага здабытку народаў на постсавецкай прасторы. Яе лаўрэатамі сталі Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры», народныя артысты СССР Аляксандра Пахмутава, Ала Пугачова, Ігар Лучанок, Эдзіта П’еха, Сафія Ратару, Уладзімір Мулявін, Андрэй Пятроў, народныя артысты Расіі Валерый Лявонцьеў, Леў Лешчанка, народны артыст Азербайджана Палад Бюльбюль-аглы.

Асноўнымі мэтамі фестывалю аб'яўляюцца: «адраджэнне, развіццё, папулярызацыя лепшых традыцый і дасягненняў нацыянальнай, сусветнай культуры і мастацтва, далучэнне да іх шырокіх пластоў грамадства; *папулярызацыя культуры Рэспублікі Беларусь на міжнародным узроўні*, пашырэнне міжнароднага культурнага супрацоўніцтва; *паказ дасягненняў* у галіне музычнага, тэатральнага, харэаграфічнага, эстраднага, цыркавога, выяўленчага мастацтваў, мастацкай літаратуры, кіно,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэлебачання, народнай творчасці; *падтрымка маладых талентаў* і наватарствы ў культуры і мастацтве; духоўнае яднанне народаў свету, стварэнне мірнай супольнасці» [1, ст. 2]. Сёння фестываль і ў нашай краіне, і, асабліва, за яе межамі лічыцца бясспрэчным сучасным *нацыянальным здабыткам,* самай яскравай падзеяй сённяшняга культурнага жыцця Беларусі.

У 2016 г. культурны міжнародны Форум адбыўся ў 25-ты раз. За ўсю гісторыю «Славянскага базару» тут пабывалі прадстаўнікі 70 краін. А галоўная інтрыга фестывалю – гэта дарослы і дзіцячы вакальныя конкурсы. Штогод на адрас Міжнароднай дырэкцыі «Славянскага базару» прыходзяць сотні заявак ад патэнцыяльных канкурсантаў з Кубы, са Злучаных Штатаў Амерыкі, з Мексікі, Ізраіля, Македоніі, Італіі.

Міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні штогод прадстаўляе публіцы беларускую эстрадную моладзь, з'яўляецца люстэркам стану і развіцця айчыннай папулярнай музыкі і выканальніцкага майстэрства канкурсантаў. У песенным спаборніцтве знаходзяць сваё адлюстраванне «правілы перамогі» ці, прынамсі, правілы паспяховага выступлення.

На першым месцы – валоданне харызмай, гэта значыць, прыроджанай якасцю маладога выканаўцы, артыста, здольнае выклікаць у гледачоў пачуццё захаплення, даверу, злучанае з высокай самаацэнкай, эмацыянальнасцю, мэтанакіраванасцю, акцёрскім майстэрствам. Яскравыя таму прыклады – Максім Сапацькоў (Макс Лорэнс), Пётр Ялфімаў, Паліна Смолава, Алена Ланская.

На другім месцы – адукацыя. Дыплом – гэта пачатак практычнай рэалізацыі сябе як асобы. Пашырэнне кругагляду, інтэлектуальнае развіццё, камунікабельнасць, выканальніцкае майстэрства, зносіны з прафесіяналамі, уменне знайсці выйсце са складанай сітуацыі – вось што дае працэс адукацыі. Для пошуку ж сваёй індывідуальнасці, рэалізацыі ўласнага патэнцыялу, абсалютнага выкарыстання таленту неабходна як адукацыя, так і самаадукацыя.

На трэцім месцы – магутны адміністрацыйны рэсурс (пратэкцыя, прадзюсіраванне, вялікія фінансавыя ўкладанні, высокі падрыхтоўчы ўзровень, прафесійныя рэпетытары і г. д.).

Уладальнікам жа Гран-пры конкурсу маладых выканаўцаў XXV Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» стаў беларус Аляксей Грос. Спявак атрымаў «Зала-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тую ліру», грашовае ўзнагароджанне, а таксама спецыяльны прыз Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі.

*1.* Пастанова «Аб Міжнародным фестывалі мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”» / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь // Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 28.03.2009, № 6.

***Н. Ю. Вайцехович***,
*кандидат педагогических наук,*
*доцент кафедры теории и истории*
*информационно-документных коммуникаций*

## КОНЦЕПТУАЛЬНЫЕ ОСНОВЫ ПРЕОБРАЗОВАНИЯ УЧЕБНОЙ КНИГИ В УСЛОВИЯХ РЕФОРМИРОВАНИЯ ВЫСШЕГО ОБРАЗОВАНИЯ

Современный этап развития национальной системы образования, направленный на активное внедрение инновационных технологий обучения, предусматривает необходимость оптимизации системы национальных учебных изданий. Задачи совершенствования университетской учебной книги, организации выпуска «нового поколения электронных учебников и пособий» обозначены как приоритетные в проекте «Национальной стратегии устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2030 года» [4]. Особое внимание развитию информационных образовательных ресурсов уделено в «Концепции информатизации системы образования Республики Беларусь на период до 2020 года». Согласно Концепции, для повышения качества высшего образования необходимо создать систему инновационных учебников и учебных пособий, обладающих мультимедийными компонентами, удобным механизмом навигации, возможностями адаптации элементов содержания под индивидуальные запросы и уровень обучающегося [3].

Изменение концептуальных основ образования (личностно-ориентированный и деятельностный подходы, переход к проблемному принципу организации обучения и т. п.), а также развитие новых форм коммуникации и информационных технологий вызвали глубокие преобразования в системе учебной книги, которые практически не осмыслены в педагогике и кни-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ